УДК 378.147:[378.147+ 37.091.313]БГУКИ

# ПАДРЫХТОЎКА СПЕЦЫЯЛІСТА САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ: ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНЫ ПАДЫХОД

***Л. І. Казлоўская,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры*
*педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле разгледжаны тэарэтычныя аспекты, звязаныя з арганізацыяй практыка-арыентаванага навучання студэнтаў: прынцыпы, метады, этапы. У рамках правядзення вытворчай практыкі прыведзены прыклады арганізацыі практыка-арыентаванага навучання студэнтаў кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, звернута ўвага на ажыццяўленне культурна-забаўляльных праграм і творчых паказаў у школах, клубных установах, цэнтрах дадатковай адукацыі і г. д.

**Ключавыя словы:** практыка-арыентаванае навучанне, сацыяльна-культурная дзейнасць, прынцыпы, метады, сацыяльна-культурныя праекты, культурна-дасугавыя праграмы.

# SPECIALIST TRAINING IN SOCIO-CULTURAL ACTIVITY: PRACTICE-ORIENTED APPROACH

***L. Kozlovskaya,***
*PhD in Pedagogy, Associate Professor, Professor of the Department*
*of Pedagogy of Social and Cultural Activities of the Educational Institution*
*«The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article examines theoretical aspects related to the organization of practice-oriented education of students: principles, methods, stages. As part of practical training, the author gives examples of organizing practice-oriented training for students at the Department of Pedagogy of Social and Cultural Activities of the Belarusian State University of Culture and Arts. The article pays attention to the implementation of cultural and entertainment activities: programs and creative performances in schools, club institutions, centers of additional education, etc.

**Keywords:** practice-oriented training, social and cultural activity, principles, methods, social and cultural projects, culture and leisure programmes.

Інтэграцыя практыка-арыентаванага падыходу ў сістэму вышэйшай адукацыі дазваляе аб’яднаць працэсы фарміравання базы фундаментальных навуковых ведаў і атрымання практычных агульнакультурных і сацыяльных кампетэнцый, якія неабходныя для паспяховай прафесійнай дзейнасці будучых спецыялістаў.

На бягучым этапе назіраецца недастатковая прафесійная кампетэнтнасць выпускнікоў і, як следства, іх нізкая канкурэнтаздольнасць на рынку працы. Адзін са спосабаў пераадолення гэтай праблемы заключаны ў рэалізацыі прынцыпаў практыка-арыентаванага падыходу падрыхтоўкі спецыяліста. Практыка-арыентаваная адукацыя – гэта прафесійна арыентаваная тэхналогія навучання, накіраваная на фарміраванне ў будучых спецыялістаў значных для прафесійнай дзейнасці ведаў, уменняў, навыкаў.

Асноўная мэта практыка-арыентаванага падыходу ў адукацыі – пабудаваць аптымальную мадэль, у якой прымяненне тэарэтычных ведаў ляжала б у аснове вырашэння практычных пытанняў, звязаных з фарміраваннем прафесійных кампетэнцый спецыяліста.

Укараненне тэхналогій практыка-арыентаванага навучання садзейнічае павышэнню матываванасці да набыцця прафесійных кампетэнцый. Найважнейшымі характарыстыкамі гатоўнасці студэнта да засваення тэхналогіі выступаюць: кампетэнтнасныя паказчыкі; здольнасці; талент; магчымасці; уласцівасці; якасці; характар; прыхільнасць; дзейнасць; патэнцыял; актыўнасць; усталёўкі і г. д.

Да асноўных прынцыпаў такога навучання можна аднесці наступныя.

***1. Прынцып практыка-арыентаванага мэтапакладання.*** Працэс навучання кожнага студэнта адбываецца з улікам яго асабістых мэт, звязаных з атрыманнем пэўнага набору кампетэнцый. У аснове гэтага прынцыпу ляжыць глыбінная якасць чалавека – здольнасць пастаноўкі мэт сваёй дзейнасці. Незалежна ад ступені ўсвядомленасці мэт чалавек жыве з патрэбай і магчымасцю ставіць і дасягаць іх.

***2. Прынцып выбару індывідуальнай адукацыйнай траекторыі.*** Студэнт мае магчымасць выбару асноўных кампанентаў сваёй адукацыі. Рэалізацыя патэнцыялу адукацыйнай праграмы магчымая толькі ва ўмовах свабоды выбару яе элементаў. Неабходна забяспечыць студэнту магчымасць выбару спосабаў дасягнення ўласных мэт, тэм творчай працы, форм яе выканання, заахвочваць да выпрацоўкі ўласнага погляду на праблему, стымуляваць фармуляванне аргументаваных высноў і адэкватнай самаацэнкі. Ступень уключэння студэнта ў канструяванне ўласнай адукацыі прама прапарцыянальна ўплывае на ступень яго індывідуальнай творчай самарэалізацыі.

***3. Прынцып прадуктыўнага навучання.*** Згодна з ім, галоўным арыенцірам навучання з’яўляецца асабістае адукацыйнае прырашчэнне студэнта, якое складаецца з яго ўнутраных і знешніх адука-

цыйных прадуктаў. Прадуктыўнае навучанне арыентавана не столькі на вывучэнне вядомага, колькі на прырашчэнне да яго новага, на стварэнне навучэнцамі адукацыйнага прадукту. У працэсе засваення зместу вывучаемых дысцыплін студэнты атрымліваюць навыкі і здольнасці, якія з'яўляюцца паказчыкамі высокага ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі ў адпаведнай вобласці дзейнасці.

***4. Прынцып першаснасці адукацыйнай прадукцыі студэнта.*** Змест, якім навучэнцы асабіста напаўняюць адукацыйную праграму, апярэджвае адукацыйныя стандарты і агульнапрызнаныя дасягненні ў дадзенай прадметнай вобласці на момант навучання. Чалавек, якому дадзена магчымасць выказаць сваю думку па вывучаемым пытанні перад выкладаннем усталяваных падыходаў, шырэй раскрывае свае патэнцыйныя магчымасці, авалодвае тэхналогіяй творчай дзейнасці, стварае адукацыйны прадукт часам больш арыгінальны, чым агульнапрызнанае рашэнне дадзенага пытання.

***5. Прынцып сітуатыўнага навучання.*** Каб арганізаваць творчую дзейнасць студэнта, выкладчык стварае або выкарыстоўвае пэўную адукацыйную сітуацыю. Яе мэта – сфарміраваць матывацыю студэнта і накіраваць яго дзейнасць на атрыманне кампетэнцый у ходзе вырашэння адукацыйных праблем. Каб чалавек стварыў свой варыянт матываванасці, ён павінен перш за ўсё зацікавіцца праблемай; яму трэба дапамагчы высветліць сэнс тэорый, іх узаемную сувязь, затым прапанаваць самастойна навучыцца выяўляць заканамернасці ў розных падыходах уплыву на людзей.

***6. Прынцып адукацыйнай рэфлексіі.*** Адукацыйны працэс суправаджаецца яго рэфлексіўным усведамленнем суб'ектамі адукацыі. Рэфлексія – гэта ўсведамленне спосабаў дзейнасці, іх якасці, выяўленне яе сэнсавых асаблівасцей. Студэнт усведамляе не толькі вынікі сваёй дзейнасці, але і яе спосабы, г. зн. тое, як атрымаліся тыя ці іншыя вынікі [2].

Калі аналізаваць практыка-арыентаваны падыход у навучанні непасрэдна на кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці БДУКМ, то перш за ўсё можна вылучыць знаёмства студэнтаў з прафесійным асяроддзем, патрабаваннямі, якія прад'яўляюцца да дадзенай прафесіі.

Даследчык Ю. К. Бабанскі падкрэсліваў, што менавіта ў працэсе практыкі можна ў поўнай меры асэнсаваць заканамернасці і прынцыпы навучання і выхавання, авалодаць прафесійнымі навыкамі, вопытам практычнай дзейнасці [1, с. 37].

На кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці распрацавана сістэма праходжання вучэбнай і вытворчай практыкі, заснаваная на прынцыпах практыка-арыентаванага навучання. Можна вылучыць тры этапы ў рэалізацыі прапанаванай сістэмы.

*На першым этапе* студэнты знаёмяцца з дзейнасцю ўстаноў культуры, цэнтраў сацыяльна-педагагічнай рэабілітацыі, дзіцячых аздараў-

ленчых цэнтраў, музеяў, цэнтраў дадатковай адукацыі і інш. Пры гэтым практыканты спачатку з'яўляюцца гледачамі, а не ўдзельнікамі і арганізатарамі розных форм культурна-дасугавай дзейнасці. У працэсе практыкі яны ажыццяўляюць аналіз якасці культурна-дасугавых праграм, які ўключае наступныя этапы:

– вызначэнне педагагічных мэт і задач з улікам спецыфікі аўдыторыі;

– выяўленне адпаведнасці зместу праграм і выхаваўчых задач;

– азнаямленне з метадамі і сродкамі выхаваўчага ўздзеяння;

– вызначэнне лагічнай узаемасувязі структурных кампанентаў праграм;

– вывучэнне методыкі вядзення праграм;

– выяўленне прыёмаў актывізацыі аўдыторыі;

– ацэнка афармлення месца правядзення праграмы.

Прапанаваная структура аналізу спрыяе фарміраванню прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для самастойнай рэалізацыі культурна-дасугавых тэхналогій і вызначэння іх выхаваўчай выніковасці.

*На другім этапе* практыкі студэнты прымаюць удзел у арганізацыі і правядзенні культурна-дасугавых праграм, дзіцячых свят, канцэртаў, фестываляў, дзейнасці дзіцячых аб'яднанняў і інш. Яны выступаюць у якасці вядучых культурна-дасугавых праграм, аўтараў сцэнарыя, выканаўцаў разнастайных творчых і арганізацыйных функцый. Практыканты знаёмяцца з індывідуальнай, групавой, масавай працай у соцыуме, прымаюць удзел у планаванні сацыякультурнай дзейнасці, што спрыяе пашырэнню іх прафесійнага кругагляду; у іх фармуюцца якасці, неабходныя для паспяховага зацвярджэння ў прафесійным соцыуме, сярод якіх:

– адаптацыйныя і камунікацыйныя навыкі (здольнасць хутка стаць часткай калектыва, усталяваць кантакты з людзьмі);

– творчыя навыкі (здольнасць да прадметнай дзейнасці, якая адрозніваецца навізной, арыгінальнасцю, развіццём фантазіі і ўяўлення);

– навыкі зносін (стыль узаемаадносін, манера, тон, паважлівае стаўленне да суразмоўцы, уменне слухаць, педагагічны такт).

Акрамя таго ўцягванне студэнта ў рэальны педагагічны працэс дазваляе педагогу вызначыць узровень яго творчых і арганізацыйных здольнасцей.

*На трэцім этапе* заданнямі практыкі прадугледжваецца самастойная падрыхтоўка і правядзенне студэнтамі культурна-дасугавых праграм. Варта адзначыць, што часцей за ўсё гэта аўтарскія культурна-дасугавыя праграмы, якія ўключаюць усе раздзелы змястоўнай і пастановачнай дзейнасці ад задумы да рэалізацыі, г. зн. мэты, задачы, сродкі, метады, характарыстыку аўдыторыі, для якой яны распрацаваны. У змесце практыкі на дадзеным этапе прадугледжана педа-

гагічная дзейнасць, якую студэнты ажыццяўляюць у каледжах культуры і мастацтваў рэспублікі. Яны распрацоўваюць і праводзяць лекцыі, практычныя заняткі для навучэнцаў каледжаў, аналізуюць вынікі сваёй дзейнасці і такім чынам адпрацоўваюць методыку выкладання спецыяльных дысцыплін.

Разгляданне праблемы практыка-арыентаванага навучання студэнтаў патрабуе адлюстравання адукацыйных магчымасцей праектнай дзейнасці. Пад метадам праектаў маецца на ўвазе такі спосаб дасягнення адукацыйных мэт, які абапіраецца на пэўную тэхналогію, якая забяспечвае ўсебаковае даследаванне праблемы і мае на мэце дасягненне рэальнага, увасобленага ў той ці іншай форме выніку [3]. Гэты метад упершыню быў прапанаваны ў пачатку XX ст. амерыканскім педагогам У. Х. Кілпатрыкам, які ў 1918 г. апублікаваў артыкул «Метад праектаў». У. Х. Кілпатрык вызначыў сутнасць новага метаду як «мэтазгодную дзейнасць, накіраваную на развіццё асобы, на шырокія межы "зоны зацікаўленасці", якія дазваляюць пралангіраваць перыяд зацікаўленасці асобы». Метад праектаў – гэта «ад душы выкананая задума» [4]. Вышэйпададзенае вызначэнне нам падаецца сутнасна блізкім да вырашэння задач фарміравання прафесійнага майстэрства спецыяліста сацыяльна-культурнай сферы.

Метад праектаў можна разглядаць таксама як шэраг узаемазвязаных вучэбна-пазнавальных прыёмаў, якія накіроўваюць студэнтаў да самастойнага рашэння задач і завяршаюцца праяўленнем вынікаў.

Студэнт павінен не толькі ўмець стварыць сацыяльна-культурны праект, але і рэалізаваць яго ва ўстановах сацыяльна-культурнай сферы. Варта адзначыць, што студэнты разам з выкладчыкамі кафедры сістэматычна распрацоўваюць і ажыццяўляюць праекты па сацыяльным патрабаванні. Так, напрыклад, за 2021/22 і 2022/23 навучальныя гады былі распрацаваны і практычна рэалізаваны ва ўстановах культуры наступныя праекты:

– «Пададзім адзін аднаму руку» (для дзяцей з інваліднасцю);

– «Подзвіг народа перажыве стагоддзі», прысвечаны 75-годдзю Перамогі (для салдацкіх клубаў і дамоў афіцэраў);

– «Парк крэатыўнага вольнага часу» (для адукацыйна-аздараўленчага цэнтра «Лідар»);

– «Адпачываем усёй сям'ёй» (для санаторна-аздараўленчых устаноў);

– «Творчасць без межаў» (для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі).

У дадзеным артыкуле разгледжаны толькі некаторыя аспекты практыка-арыентаванага навучання студэнтаў кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці БДУКМ. Рэалізацыя гэтага падыходу ў ходзе прафесійнай адукацыі будучых спецыялістаў сацыякультурнай дзейнасці спрыяе іх паспяховаму прафесійнаму самавызначэнню.

*1. Бабанский, Ю. К.* Методы обучения в современной общеобразовательной школе / Ю. К. Бабанский. – М. : Просвещение, 1985. – 148 с.

*2.* Переподготовка и повышение квалификации кадров как фактор развития культурной среды регионов России : коллектив. моногр. / Т. В. Кузнецова, В. А Ремизов, В. С. Садовская. – М. : МГУКИ, 2012. – 126 с.

*3.* Эффективность взаимодействия образовательных учреждений и бизнес-среды: теория, методология, практика : коллектив. моногр. / Т. Н. Бондаренко [и др.] ; под науч. ред. д-ра экон. наук, проф. А. П. Латкина. – Владивосток : АГУЭС, 2010. – 188 с.

*4. Kilpatric, W. H.* The Project Method / W. H. Kilpatric // Teachers College Record. – 1918. – № 19. – P. 319–335.